№ 25 (714)
Ліпень 2018 года

Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года

bfk.by

У нумары:

☞ Імпрэза: *літаратурныя чытанні ў Флер'янове* – *стар. 2*

☞ «Па-за кадрам»: *як павязаныя сям'я і гісторыя дзяржавы* – *стар. 3*

☞ Малая радзіма: *Ганцавічы – ад фальварка да горада* – *стар. 4*

Карціна Віктара КОЛАСА

На тым тыдні...

✓ **26 чэрвеня** ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы адбылося адкрыццё выставачнага праекта **«Сцэнаграфія Мсціслава Дабужынскага»** з фондаў Літоўскага музея тэатра, музыкі і кіно. Праект рэалізуецца з дапамогай Пасольства Літоўскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь.

Выстаўка прысвечаная аднаму з найбольш знаных тэатральных мастакоў XX ст., чый творчы і жыццёвы шлях (1875 – 1957) цесна звязаны з Маркам Шагалам, Львом Бакстам, Сяргеем Дзягілевым. Мастак браў удзел у арганізацыі Віцебскага мастацкага вучылішча, быў першым яго дырэктарам. У 1925 г. атрымаў літоўскае грамадзянства, жыў у Коўне (Каўнасе), уключыўся ў культурнае жыццё краю: арганізоўваў персанальныя выстаўкі, удзельнічаў у выставах літоўскага мастацтва. Далейшая біяграфія звязаная з Заходняй Еўропай і ЗША.

Важнае месца ў творчасці М. Дабужынскага займае сцэнаграфія. Ён аўтар эскізаў касцюмаў і дэкарацыяў 38 пастановак Дзяржаўнага літоўскага тэатра. На выстаўцы прадстаўленыя арыгіналы твораў мастака з калекцыі Літоўскага музея тэатра, музыкі і кіно; у 2009 г. збор быў прызнаны дакументальнай спадчынай сусветнага значэння, уключаны ў літоўскі нацыянальны рэгістр праграмы ЮНЕСКА «Сусветная спадчына».

У межах выставачнага праекта адбылося прадстаўленне спадчыны М. Дабужынскага з прыватных калекцыяў, што захоўваюцца ў Беларусі. Многія творы экспануюцца ўпершыню.

✓ **30 чэрвеня** на тэрыторыі Музея народнай архітэктуры і побыту пад Мінскам прайшоў **рок-фестываль «Наш дзень»**, у якім бралі ўдзел 12 найлепшых імёнаў сучаснай беларускай рок-музыкі: «Volski», «Dzieciuki», «Akute», «B:N:», «Дай дарогу!», «Nizkiz», «Крама», «The Superbullz», «Мутнаевока», Зміцер Вайцюшкевіч і Пётр Клюеў. Арганізатары адзначаюць, што «ў афішы ўсё больш фэстаў з удзелам папулярных замежных артыстаў. Але трохі крыўдна, што класныя беларускія музыкі часцяком застаюцца на другім плане. Мы хочам выправіць гэтую сітуацыю па прыкладзе суседніх краінаў, дзе даўно шмат фэстаў з акцэнтам на сваю музыку». Апроч канцэртнай праграмы былі адукацыйныя актыўнасці, гульні для дзяцей і дарослых, цікавыя квэсты, кірмаш ды іншыя забавы.

✓ **2 ліпеня** трэці раз у Мінску прайшло **свята «Дзень вышыванкі»**. Асноўныя мерапрыемствы праходзілі перад Палацам спорту. У яго рамках адбыўся «Беларускі кірмаш», на якім былі салон беларускага арнаменту «Родныя ўзоры», пляцоўка «Народныя гульні», літаратурная гасцёўня «Смак роднай мовы», майстар-класы «Горад майстроў», выстаўка аграсядзібаў «Запрашаем да нас», дзіцячая гульнявая пляцоўка «Краіна дзяцінства» ды інш. Ахвочыя пазнаёміліся з экспазіцыяй удзельнікаў і пераможцаў конкурсу «Сэлфі&фота з вышыванкай», бралі ўдзел у стварэнні гістарычных працаў у стылі графіці, за паспяховы ўдзел у віктарыне атрымалі ў падарунак дызайнерскую майку з беларускім арнаментам, гулялі ў народныя гульні. Для малечы лялечны тэатр «Батлейка» аддзела рамёстваў і традыцыйнай культуры Лідскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці падрыхтаваў прадстаўленне паводле беларускіх казак.

Майстры народных промыслаў пазнаёмілі з традыцыйнымі рамёствамі.

З каларытам традыцыйнай вёскі пазнаёміліся на пляцоўцы аграэкатурызму «Запрашаем да нас», дзе былі падворкі сядзібаў «Медвежья Завала» (Баранавіцкі раён), «Хутор Ёдишки» (Браслаўскі раён), «Спадчына» (Смаргонскі раён), «Равновесие» (Валожынскі раён), «Серая шейка», «Лесной двор», «У Князева в Любуже» (Магілёўскі раён), «Сядзіба Дудзіка» (Быхаўскі раён), этнахутар «Зелёная Роща» (Магілёў).

На галоўнай сцэне адбылося дэфіле мадэляў «Вянок прыгажосці», выступленне творчых калектываў краіны, фолк і фолк-рок-гуртоў, «Disco-folk "Вышыванка.by"».

Свята Сонца над Пціччу

Трэці міжнародны fire-folk фестываль «Свята Сонца» прайшоў 16-17 чэрвеня ў музейным комплексе «Дудуткі». Традыцыйна было шмат агню, музыкі, анімацыйных пляцовак і купальскіх абрадаў. Фармат фестывалю ў рамках адной канцэпцыі аб'ядноўвае некалькі разнапланавых мерапрыемстваў: фестываль-конкурс фаер-шоу, open-air канцэрт на дзвюх сцэнах, вялікі кірмаш рамеснікаў, інтэрактыўныя пляцоўкі.

На вялікай фестывальнай сцэне выступілі знакамітыя беларускія і замежныя калектывы: «Volski», «Тролль Гнёт Ель», «Re1ikt», «Irdorath», «Pawa», «Fram Yann Zhanchak», «Яварына», «Кацярына Ваданосава і Fantasy Orchestra», «Кетри», «Vodar», «Без Паники» ды інш. Скончыўся канцэрт пад архаічныя балта-славянскія песні, што падрыхтаваў у рамках новай праграмы ambient-праект «Pragnavit».

Адно з самых відовішчных мерапрыемстваў «Свята Сонца» – Фестываль Агню, у межах якога майстэрства паказалі дзясяткі камандаў, што выступаюць у жанры «вогненнае шоу».

Максімум увагі, як і раней, было нададзенае аднаўленню традыцыяў і абрадаў нацыянальнай беларускай культуры і святу Купалле ў прыватнасці. Асаблівая ўвага на сёлетнім фестывалі надавалася традыцыям святкавання дня летняга сонцастаяння ў народаў Літвы, Фінляндыі, Вялікабрытаніі.

Пасля завяршэння асноўнай праграмы ўначы цэнтральная дзея фестывалю перамясцілася з музейнага комплексу на бераг ракі Пціч. Там запалалі вялікія купальскія вогнішчы, рачная плынь панесла купальскія вянкі, над вадою гучала старадаўняя музыка, а ўсе ахвотныя змаглі скочыць праз ачышчальны купальскі агонь.

Паводле інфармацыі арганізатараў

Нашы спачуванні

26 чэрвеня пайшоў з жыцця педагог, пісьменнік, краязнаўца, збіральнік самабытнай народнай лексікі **Алесь ЗАЙКА**. Руплівец жыў у роднай вёсцы Заполле Івацэвіцкага раёна. Кола яго навуковых зацікаўленняў абыймала дыялекталогію, фразеалогію, парэміялогію, мікратапаніміку, фалькларыстыку і гісторыю сялібаў.

Пры жыцці выдаў «Дыялектны слоўнік Косаўшчыны» (2011), «Населеныя пункты Івацэвіччыны» (2012), «Фразеалагічны слоўнік Косаўшчыны» (2013), «Прыказкі і прымаўкі, жарты і каламбуры, прыгаворкі і языкаломкі, вясельныя прымаўкі пры дзяльбе каравая, вітанні і зычэнні, ветлівыя і ласкавыя выразы, засцярогі і прысяганні, праклёны і адкляцці, жартоўныя праклёны і дражнілкі-кепікі, зневажанні і параўнанні, прыкметы народнага календара з Косаўшчыны» (2015), а таксама кнігу кароткай прозы «Чысты чацвер» (2015). У нашым выданні мы не раз знаёмілі чытачоў з ягонымі знаходкамі, распавядалі пра кнігі рупліўцы. Прыкладна праз месяц у выдавецтве «Тэхналогія» выйдзе «Мікратапаніміка Івацэвіччыны». Выдаць кнігу планавалася да ягонага 70-годдзя, 12 жніўня – наладзіць прэзентацыю. Там аўтар хацеў звярнуцца з заклікам да краязнаўцаў, да ўсіх зацікаўленых людзей збіраць мікратапонімы, сістэмна занатоўваць найменні ўсіх урочышчаў (пушчаў, лясоў, гаёў, балотаў, балацінаў, ручаёў, крыніцаў, паплавоў, лугоў, равоў, пагоркаў, канаваў, старых дарог – усіх адметных мясцінаў). А. Зайка лічыў: «Гэта складовая частка нашай мовы і гісторыі, наш нацыянальны скарб, які імкліва знікае. Бо адыходзіць старое пакаленне, людзі, для якіх тыя сцежкі-дарожкі, палеткі, сенажаці, азёры ды рачулкі, дзе прайшло іх жыццё, былі дарагімі сэрцу мясцінамі, з якімі навек зрадніла душа. Нельга дапусціць, каб гэта бясследна прапала. Гэта мова нашай зямлі». І дадаваў: «У Швейцарыі знойдуць якое адметнае слоўца і ладзяць дзеля яго цэлую навуковую канферэнцыю, а мы, маючы такое багацце, гэтак нядбайна да яго ставімся».

Усё жыццё Алесь Фаміч збіраў фальклор, запісваў крылатыя словы, дыялекты, выслоўі, фатаграфаваў старыя будынкі, студні, клямкі, вокны, а матэрыялы да «Дыялектнага слоўніка Косаўшчыны» збіраў і запісваў 35 гадоў.

Сёлета 12 жніўня А. Зайку споўнілася б 70 гадоў.

Супрацоўнікі ГА «Беларускі фонд культуры» і «Краязнаўчай газеты» шчыра смуткуюць з прычыны смерці выбітнай асобы. Выказваем спачуванні родным, блізкім і калегам спачылага.

Літаратурныя чытанні ў Флер'янове

Упачатку дваццатага стагоддзя флер'яноўская сядзіба, што належала вядомаму роду Бохвіцаў, была адным з асяродкаў беларуска-польскіх культурных зносінаў. Бохвіцы былі не толькі добрымі гаспадарамі, але і гасціннымі людзьмі, патрыятычнымі ды інтэлігентнымі. Таму іх дом прыцягваў слынных асобаў з навакольных сядзібаў. Частымі гасцямі тут былі Рэйтаны з Грушаўкі, Ажэшкі з Людвінава, Радзівілы з Нясвіжа і іншыя асобы. У маёнтку збіралася мясцовая інтэлігенцыя, вяліся інтэлектуальныя размовы, абмяркоўваліся навіны літаратуры, падзеі культурнага жыцця краіны. Вечарамі ладзілі прадстаўленні «флер'яноўскага тэатрыка», дзе акцёрамі выступалі самі знатныя госці. Усё адбывалася на фоне цудоўных мясцовых краявідаў. Вёснамі квітнеў сад, стракатым дываном высцілалі яго палявыя кветкі, а паркавыя алеі клікалі ў бясконцасць...

Аднавіць традыцыю правядзення літаратурных вечароў вырашылі ў 2016 годзе. Па ініцыятыве аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі і Ляхавіцкай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы у Год культуры тут адбыліся Першыя «Флер'яноўскія чытанні», прымеркаваныя да 175-годдзя з дня нараджэння Элізы Ажэшкі. Мерапрыемства прыйшлося даспадобы ўсім прысутным.

Сёлета ў сярэдзіне чэрвеня літаратурны фестываль зноў запрасіў на свята. Вельмі сімвалічна, што Другія «Флер'яноўскія чытанні» праходзілі ў Год малой радзімы. Ганаровыя госці мерапрыемства – нашыя землякі Алесь Бадак, Галіна Жывіца, Фёдар Лапанік, Ларыса Глеб. Узгадвалася творчасць Уладзіміра Дамашэвіча, Леаніда Пранчака і Івана Ждановіча. А. Бадак перадаў прывітальнае пісьмо ўдзельнікам і гасцям літаратурнага фестывалю «Флер'яноўскія чытанні» ад міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Алеся Карлюкевіча. Пад час тэатралізаванага прадстаўлення гучалі паэтычныя творы і песні нашых землякоў. Скарысталіся магчымасцю пазнаёміць са сваёй творчасцю і менш знакамітыя аматары паэзіі нашага раёна і суседняга Баранавіцкага.

Госці свята ўпадабалі разнастайныя конкурсы і віктарыны. Свае выстаўкі прадставілі Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь, музей ваеннай гісторыі, выдавецтва «Мастацкая літаратура». Калектывы мастацкай самадзейнасці Ляхавіцкага раёна падрыхтавалі цудоўны канцэрт.

Узгадваючы словы Ніла Гілевіча, можна з упэўненасцю сказаць: «пакуль паэты будуць пець», нашая ляхавіцкая зямля не застанецца безыменнай, «зямлі бацькоў не анямець»! Спадзяемся, што «Флер'яноўскія чытанні» традыцыйна адбудуцца ў 2020 годзе.

Пастаноўка паводле апавядання Уладзіміра Дамашэвіча «Заклінаю ад кулі»

Ларыса Глеб

Алесь Бадак

Алена МІКУЛІЧ,
бібліятэкар аддзела бібліятэчнай рэклямы і маркетынгу Ляхавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Янкі Купалы

Пошукі адказаў на простыя пытанні пра гісторыю сям'і

Нядаўна ў Мінску ў Мемарыяльным музеі-майстэрні Заіра Азгура адбылося прадстаўленне вынікаў конкурсу «Па-за кадрам: ад гісторыі сям'і да гісторыі супольнасці». Ён праводзіцца Прадстаўніцтвам зарэгістраванага аб'яднання «Deutscher Volkshochshul-Verband e.V» (ФРГ) у Рэспубліцы Беларусь у супрацоўніцтве з Моладзевым грамадскім аб'яднаннем «Гісторыка» ў рамках праекта «Конкурсы па гісторыі ў Беларусі, Грузіі, Малдове, Украіне» пры падтрымцы Міністэрства замежных справаў Германіі.

Праект скіраваны на аказанне садзейнічання ў развіцці гістарычных конкурсаў у гэтых краінах і рэалізуецца «DVV International» і Фондам імя Кёрбера ў партнёрстве з міжнароднай сеткай «Eustory» і мясцовамі арганізацыямі. Усяго паступілі 98 працаў, гэта 116 удзельнікаў, 66 куратараў. У сустрэчы прынялі ўдзел лаўрэаты конкурсу – 18 юнакоў і дзяўчатаў з Віцебска, Ліды, Узды, Нарачы, Кобрыны, Германавічаў, Мірнага, Магілёва, Оршы, Кіраўска, Брэста, Ружнаў, Відзаў, а таксама іх куратары.

Кіраўнік прадстаўніцтва «DVV» у Рэспубліцы Беларусь Галіна Верамейчык

З ініцыятывы нямецкага Фонду Кёрбера (ён займаецца адукацыйнымі праектамі) у Еўропе існуе своеасаблівая сетка нефармальнага навучання «Eustory». З 1998 года прайшоў шэраг конкурсаў, датычных гісторыі XX стагоддзя, у розных краінах з самымі рознымі партнёрамі. У нас праводзіліся конкурсы сумесна з аб'яднаннем «Дыярыуш», ТБМ, Беларускім архівам вуснай гісторыі, і каля 1400 маладых беларусаў бралі ў іх удзел, 23 прадстаўнікі Беларусі выязджалі на міжнародныя сустрэчы.

Пасля прывітальных словаў арганізатараў конкурсу намеснік Пасла ФРГ у Рэспубліцы Беларусь Аня Лютэр (чыё выступленне было цалкам пабеларуску) падзялілася такімі развагамі:

– Для майго пакалення даведацца, што прычынілі немцы іншым народам, было ранаю. Памятаю, як мне 11-гадовай мама дала пачытаць дзённік Ганны Франк. Мае бацькі былі дзецьмі пад час Другой сусветнай вайны, але іхнія бацькі былі дарослымі. Адной бабулі і адному дзядулю я змагла задаць некалькі пытанняў: хто? як? чаму? Але ёсць усеагульнае разуменне, што заўсёды варта асэнсоўваць сваю гісторыю. Не толькі ваенную – горада, народа, краіны. Асабліва – сваёй сям'і. Таму я радая, што ўдзельнікі конкурсу змаглі зазірнуць у маленькую гісторыю, якая расказвае пра сутнасць чалавечага жыцця.

Сваім досведам працы, звяртаючыся да вучняў, падзяліўся і Андрэй Мастыка, каардынатар праекта «Беларускі архіў вуснай гісторыі», сябра МГА «Гісторыка»:

– Мы і раней праводзілі конкурсы, але яны былі больш лакальнага характару. Гэты конкурс – агульнанацыянальны. Цешуся, што ён стаў своеасаблівым сродкам зваротнай сувязі з моладдзю. Спадзяюся, што працягнецца і сама ініцыятыва, і што ваш інтарэс да айчыннай гісторыі толькі пачаўся. Зазвычай найноўшая гісторыя суха вывучаецца і ўспрымаецца на ўроках ці лекцыях. Але дзякуючы метаду вуснай гісторыі, дзякуючы чалавечаму патэнцыялу яе вывучэнне праз гісторыю сям'і стане значна цікавейшаю. Гэта сапраўды жывая гісторыя.

Каця Фаўсер

Аня Лютэр

Ва ўрачыстай абстаноўцы пераможцам конкурсу былі ўручаныя дыпломы і каштоўныя падарункі, былі адзначаныя і куратары працаў. А пераможцы, якія занялі першыя месцы ў сваіх узроставых катэгорыях, атрымалі магчымасць паехаць у Германію ў міжнародны маладзёжны летнік (гэта Вераніка Астроўская з гімназіі № 7 г. Віцебска, Іван Свідуновіч з СШ № 4 г. Кобрына, Дзмітрый Стэльмах з Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г. Кіраўска, Анастасія Чаркес, супрацоўніца Беларускага народнага банка).

ГА «Беларускі фонд культуры» і «Краязнаўчая газета» таксама адзначылі дзве працы. Гэта «Жыццёвая дарога і духоўная дзейнасць протаіерэя Георгія Сапуна з вёскі Пачапава Баранавіцкага раёна» і «Адно шчасце для дваіх: вяселле ў часы "застою"». Іх аўтары – Таццяна Мастоўская з навучальна-педагагічнага комплексу Пачапаўская дзіцячы сад-сярэдняя школа Баранавіцкага раёна і Аліна Нячай з СШ г.п. Мір Карэліцкага раёна адпаведна – атрымалі Грамату БФК і кнігі, выдадзеныя фондам. Добрым дадаткам да падарункаў стане і публікацыя некаторых працаў на старонках нашага выдання (некалькі ўжо надрукаваныя), таму, каб не прапусціць свае працы і калегаў, варта сачыць за газетаю, падпісацца на яе.

Апроч узнагароджання, прайшлі абмены ўражаннямі ад конкурсу, выказваліся ідэі і прапановы па правядзенні наступных конкурсаў па найноўшай гісторыі. «Па-за кадрам...» можа стаць рэгулярным конкурсам, бо сямейныя фотаальбомы захоўваюць нямала цікавостак і адкрыццяў для ўедлівых даследчыкаў.

– Сёння маладое пакаленне павінна раскрываць свой патэнцыял, авалодваць ведамі, крэатыўным мысленнем, бо без гэтага няма сучаснага грамадства і няма будучыні, – адзначыла начальнік аддзела Нацыянальнага інстытута адукацыі Вольга Пеўзнер. – Мэты гэтага конкурсу надзвычай важныя – сацыякультурныя зносіны, вывучэнне традыцыяў, гісторыі сям'і, грамадства. І калі б не гэты конкурс, можа, вучні не заўсёды і пацікавіліся б тымі ці іншымі фактамі з гісторыі сваёй сям'і. Таму працягвайце вывучаць яе.

Скончыць жа публікацыю варта словамі праграмнага дырэктара «Eustory» Фонду Кёрбера Каці Фаўсер:

– Падобныя гістарычныя конкурсы – гэта добры інструмент, каб зацікавіць моладзь уласнай гісторыяй, гісторыяй грамадства. Наш падыход такі – маладыя людзі навучаюцца праз даследаванне ў рамках працы, што робіцца. Мы не ставім моладзі пытанні, а падштурхоўваем, каб яна сама ставіла пытанні: як мая гісторыя, гісторыя сям'і звязаная з т.зв. вялікай гсіторыяй, з тымі дзядзькамі, якіх мы сёння бачым тут (нагадаю, што імпрэза адбывалася ў музеі З. Азгура сярод скульптурных выяваў савецкіх палітычных і культурных дзеячаў. – **У.П.**). Пытанне падаецца вельмі простым, але тая праца, што за ім ідзе, надзвычай складаная. Трэба ўмець арганізаваць праект, трэба ўмець працаваць у камандзе, збіраць і апрацоўваць інфармацыю... Усё гэта прыдасца чалавеку, нават калі ён не збіраецца стаць гісторыкам.

Вікторыя Астроўская

Іван Свідуновіч



Анастасія Чаркес

Уладзімір ПУЧЫНСКІ,
сябра журы конкурсу «Па-за кадрам: ад гісторыі сям'і да гісторыі супольнасці»
Фота аўтара і Юліі ЛАЎРАНКОВАЙ

Уручэнне ўзнагароды Аліне Нячай

Фотафакт

Майстры аддзела рамесніцкай дзейнасці «Карэліцкі дом рамёстваў» прынялі ўдзел у фестывалі нацыянальных культураў у Гродне. Дзяўчаты не проста паехалі на іншых паглядзець і сябе паказаць. Яны прывезлі дадому спецыяльны дыплом абласной выстаўкі-конкурсу «Народная лялька» ў намінацыі «Найлепшая абрадавая лялька». Лялька Васіліна зрабілі ў сінім і жоўтым колерах, што расквечваюць карэліцкія сцяг і герб. Вопратку аздобілі складанымі саламянымі ўзорамі. Вобраз дапоўніла каса з ільнянога валакна, якім так ганарацца на Карэліччыне.

Юлія БАЯРЭНКА,
загадчык аддзела рамесніцкай дзейнасці Карэліцкага дома рамёстваў

Сёлетні год з'яўляецца знакавым для Ганцавічаў. 6 снежня 1973 г. гарадскі пасёлак, адміністрацыйны цэнтр Ганцавіцкага раёна, атрымаў статус горада. Акрамя таго, згодна з афіцыйнай гістарыяграфіяй, у 1898 г. Ганцавічы былі заснаваныя. Гэтая дата пазначаная на геральдычным знаку ў гарадскім скверы.

Аднак у мясцовых краязнаўцаў існуюць розныя погляды і падыходы датычна часу ўзнікнення нашага палескага места: 1773 г. – першая згадка пра фальварак Ганцавічы, 30 снежня 1884 г. – адкрыццё чыгуначнай станцыі Ганцавічы, 1898 г. – утварэнне пасёлка пры чыгуначнай станцыі, 1902 г. – зацвярджэнне плана пабудовы мястэчка Ганцавічы ў Мінскім губернскім праўленні. Але гэтым разам мне хацелася б разгледзець пытанне, калі Ганцавічы сталі мястэчкам. Прагледзеўшы дакументы ў Ганцавіцкім раённым краязнаўчым музеі, я даведаўся шмат цікавага.

Калі Ганцавічы сталі мястэчкам?

У 1902 г. была складзеная ведамасць пасёлка пры станцыі Ганцавічы Палескіх чыгунак. Паводле яе час узнікнення пасёлка – 1898 г., прычынаю стала будаўніцтва шкляного завода, продаж лесу ў маёнтках Ганцавічы, Круговічы і з маёнткаў князя Радзівіла, размешчаных паблізу станцыі Ганцавічы і ўрочышча Ельна. Пасёлак быў утвораны на зямлі графа Станіслава Адольфавіча Гутэн-Чапскага з маёнтка Ганцавічы. Была пазначаная колькасць жыхароў і сярэдні прырост насельніцтва за апошнія тры гады: іўдзеяў – 96 і 21 чалавек адпаведна, хрысціянаў – 216 і 32 жыхары адпаведна.

Мясцовыя жыхары хрысціянскага веравызнання працавалі на шкляным заводзе, яўрэі займаліся дробным гандлем і гандлем лясными матэрыяламі, а таксама камісіянерствам па адпраўцы грузаў. Акрамя шкляного завода ў пасёлку былі дзевяць дробных крамаў, адна казённая вінная крама. У населеным пункце значацца адна каменная пабудова, 85 драўляных дамоў для жылля, 62 халодныя (гаспадарчыя) памяшканні.

За тры гады памер гандлёвага абароту шкляного завода, які належаў прамыслоўцам Вільгельму Краеўскаму і Юліусу Столе, склаў 110 000 руб., па лясных аперацыях і камісіянерстве – 120 000 руб., у дробным крамным гандлі – 12 000 руб., у вінай краме – 15 000 руб.

Верагодна, хадайніцтва на заснаванне мястэчка граф Гутэн-Чапскі падаў на пачатку 1902 г. праз мешчаніна Шая Натавіча Хігеровіча. Адміністрацыйная і папяровая валакіта па гэтым пытанні закруцілася вясною таго ж года. Для збору неабходных дакументаў 6 чэрвеня 1902 г. са Слуцка выехаў прыстаў – нехта Сарокін. У вёсцы Ганцавічы ён правёў апытанне, а ў вёсцы Любашава таго ж 6 чэрвеня адбыўся сход сялянаў Любашаўскага сельскага таварыства. Усё гэта было зроблена для пацвярджэння, што зямля, на якой планавалася заснаванне мястэчка, належала выключна графу Гутэн-Чапскаму.

Тартак (лесапільны завод) Капытмана, 15 красавіка 1934 г.

Пасля адпаведных праглядала гэтае пытанне, вырашыла: «Адкрыццё мястэчка Ганцавічы з'яўляецца пажаданым, але можа быць здзейсненае толькі ў тым выпадку, калі ўладальнік прыме таксама на свой рахунак утрыманне ў праектуемым мястэчку хаця б аднаго пешага ўрадніка. Паколькі без такога нагляд за гэтым насельніцтвам (пасяленнем) будзе вельмі абцяжараны, па-першае, з-за таго, што адкрываецца права пасялення яўрэйскаму насельніцтву, а затым і таму, што мясцовасць гэтая знаходзіцца на самай ускраіне павета, і ўраднік, у раёне якога яна знаходзіцца, заведуе дзвюма валасцямі».

Пасля абмеркавання і зацвярджэння праекта ў павеце і губерні ён быў напраўлены ў Міністэрства ўнутраных спраў у Санкт-Пецярбург. Але цікава, што прашэнне падавалася ад графа Станіслава Адольфавіча Гутэн-Чапскага праз яго паверанага двараніна Івана Станіслававіча Тамашэўскага. А куды знікла з дакументаў імя мешчаніна Шая Натовіча Хігеровіча? Можа, справа ў нацыянальнасці апошняга?

Прашэнне аб заснаванні мястэчка Ганцавічы гаспадарчы аддзел Міністэрства ўнутраных спраў вярнуў як «не надлежащее удовлетворению»: «У цяперашні час новых мястэчак з уласцівым ім местачковым мяшчанскім упраўленнем не засноўваецца... Яны маглі быць заснаваныя толькі ў такіх пасяленнях, якія ўжо значыліся мястэчкамі, пры ўвядзенні ў гарадах Гарадавога Палажэння 1870 г. і былі раней прыпісаныя да гарадоў...». Дакументы былі вернутыя Тамашэўскаму. Ці можна лічыць падставы для адказу грунтоўнымі? Наўрад ці. Хаця згодна з прыведзенымі дакументамі ўсё правільна, прычына адмоўнага адказу, мне падаецца, у іншым.

Дзіўны факт, але подпіс пад адмоваю ад сваёй задумкі Гутэн-Чапскі паставіў толькі ў 1908 г., пры тым што паверaны яго атрымаў гэтыя дакументы ў красавіку 1903 г. Фактычна толькі тады і была пастаўленая кропка ў спробе заснаваць мястэчка Ганцавічы. Справа аб статусе пасялення Ельна-Ганцавічы (менавіта так яно названае ў дакуменце. – **В.Г.**) усплывае ў 1909 г. Але здзіўляе адказ будаўнічага аддзялення Мінскага губернскага праўлення: там нават не ведалі пра адказ з Міністэрства ўнутраных спраў. Канчатковы адказ па гэтым пытанні даў у сваім пісьме непасрэдна віцэ-губернатар. «...Губернскае праўленне апавяшчае, што пасяленне Ельна-Ганцавічы Слуцкага павета да разраду гарадскіх не належыць. У 1902 г. паверaны ўладальніка гэтага пасялення графа Гутэн-Чапскага – Хігеровіч (прозвішча апошняга ў дакуменце закрэсленае алоўкам. – **В.Г.**) падаў хадайніцтва аб пераўтварэнні яго ў мястэчка.

Мястэчка Ганцавічы, цэнтральны пляц (1930-я гг.)

Віталь ГЕРАСІМЕНЯ,
галоўны захавальнік фондаў Ганцавіцкага раённага краязнаўчага музея

(Заканчэнне ў наступным нумары)

Сон на вуллях і сцяжына ў «Налібоцкім»

Валожынскі раён, які цягам гадоў ажыццяўляе розныя праекты для разнастайвання і паляпшэння жыцця землякоў, нядаўна прапанаваў новыя ініцыятывы. Каб пабачыць іх, камунікацыйнае агенцтва «EZERIN'COM» зладзіла прэс-тур для журналістаў нацыянальных СМІ. Асноўным мерапрыемствам стала ўрачыстае адкрыццё выстаўкі «Праекты ў асобах» і экасцяжыны праекта «Валожын без бар'ераў» з удзелам супрацоўніка Прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі і старшыні Валожынскага райвыканкама Мікалая Астрэйкі. Пад час паездкі можна было пазнаёміцца і з іншымі ініцыятывамі, рэалізаванымі ў раёне пры фінансавай падтрымцы ЕС.

У в. Міжрэчча журналісты наведалі «Апідомік пры аграсядзібе і СФГ "Мядовая каралева"». Тут аказваюць аздараўленчыя паслугі «сон на вуллях». Вулей і рой у ім – своеасаблівы арганізм, што складаецца з тысячаў асобінаў. І здаўна заўважана, што ягонае «дыханне», працоўны гул станоўча ўздзейнічае на арганізм чалавека. А ў в. Замасцяны пры аграсядзібе «За масточкам» працуе ініцыятыва «Птушка ў аб'ектыве». Тут гасцям прапанавалі агледзець прэзентацыйны пакой, дзе будуць паказваць фота і відэа замасцянскіх птушак. Паколькі тэрыторыя сядзібы прылягае да возера, назіраць за птушкамі можна і там.

У Валожыне ў фізкультурна-аздараўленчым комплексе адбылося адкрыццё фотавыстаўкі «Праекты ў асобах». Апроч М. Астрэйкі і прадстаўніка ЕС выступілі аўтар фотаздымкаў, фотамастачка Юлія Мацкевіч і герой праекта «Валожын без бар'ераў: Узмацненне магчымасцяў для прадастаўлення сацыяльных і рэкрэацыйных паслугаў для людзей з інваліднасцю ў Валожынскім раёне» Уладзімір Патапенка.

Заключным мерапрыемствам прэс-тура стала цырымонія адкрыцця экалагічнай сцяжыны праекта «Валожын без бар'ераў» (в. Белакорац). Экасцяжына, адаптаваная для людзей у інвалідных вазках і людзей са слабым зрокам, мае працягласць 1,3 км. Аб значнасці з'яўлення такога аб'екта выказалася менеджар праекта «Валожын без бар'ераў» Мясцовага фонду спрыяння развіццю міжнароднага дыялогу і супрацоўніцтва «Інтэракцыя» Ірына Іванова. Першую экскурсію правёў дырэктар Рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Налібоцкі» Васіль Гуркоў.

Уладзімір ПУЧЫНСКІ
(паводле паведамлення камунікацыйнага агенцтва «EZERIN'COM»)

«Экслібрыс» гістарычны: у чаканні добрай прозы

Нагадаем, працягваецца прыём працаў на штогадовы конкурс «Экслібрыс», абвешчаны ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў». Сёлета «Экслібрыс» прысвечаны 100-годдзю Беларускай Народнай Рэспублікі. Творы маладых аўтараў і аўтарак на гістарычную тэматыку ў паэзіі, прозе, эсэістыцы, драматургіі прымаюцца да 1 жніўня. Умовы конкурсу апублікаваныя на сайце http://lit-bel.org/ і ў «Краязнаўчай газеце» № 9 за 2018 год.

А пакуль удзельнікі працуюць над тэкстамі, прапануем чытачам інтэрв'ю з сябрам журы конкурсу – беларускай пісьменніцай і перакладчыцай Вольгай Іпатавай.

– Галоўная парада ад вас для ўдзельнікаў «Экслібрыса», што спрабуюць сябе ў гістарычнай тэматыцы, – якая яна?

– Галоўная задача пісьменніка – пісаць цікава, каб чытач сам пасля палез у гістарычныя падручнікі ды дапаможнікі.

– На Вашую думку, як вывучэнне гісторыі ўплывае на ўспрыманне рэчаіснасці чалавекам?

– Калі чалавек жыве не толькі сваім часам, ён як бы набывае дадатковы аб'ём як асоба. Навошта нам, напрыклад, ведаць герояў Старажытнай Грэцыі ці Рыма? Ды таму, што свет для нас пашыраецца, паглыбляецца, мы ўбіраем у сябе пласты старажытнасці і можам ці то браць прыклад з герояў, ці то пагарджаць здраднікамі ў Сярэднявеччы, у час Вялікай Айчыннай вайны – адным словам, мы ўзбагачаем сваю памяць і ўяўленне «веданнем усіх багацяў, якія выпрацавала чалавецтва». Іначай – для чаго яму ўвогуле працаваць, гэтаму чалавецтву?

– Якія тэндэнцыі развіцця гістарычных твораў у Беларусі і ў свеце Вы б адзначылі?

– Часта бывае, што займальнасць перавышае патрэбную «дозу», і тады няма глыбіні, а ёсць імкненне аўтара ў што б там ні было спадабацца чытачу, а не весці яго за сабой, як бы ў пошуку клада, да якога яшчэ трэба дабрацца і затраціць на гэта пэўны час і працу... Мне здаецца, такая тэндэнцыя ўмацоўвае свае пазіцыі ў сучаснай гістарычнай прозе. Прынамсі, такой мне часам здаецца проза Акуніна...

– Хто з беларускіх аўтараў для Вас аўтарытэт у гэтай тэматыцы?

– Мне думаецца, што тут няма нікога, хто мог бы параўнацца з Уладзімірам Караткевічам.

– Ідэальны сучасны твор гістарычнай тэматыкі, які прыцягнуў бы новыя катэгорыі чытачоў, – які ён?

– Твор, які праз глыбіню гісторыі зможа падняць самыя вострыя праблемы сучаснасці. Мой раман «Залатая жрыца Ашвінаў» стаў магчымасцю паразважаць, як спалучэнне прыгажосці, розуму і таленавітасці ў жанчыны дае Асобу, якая запальвае сэрцы сучаснікаў натхненнем – гэтым боскім агнём, які даецца як узнагарода для душы і сэрца.

– Чаго Вы чакаеце як сябра журы ад аўтараў, чые творы вы будзеце ацэньваць? Ці ёсць у Вас ужо цяпер пэўны набор крытэрыяў?

– Перш за ўсё чакаю добрай беларускай прозы, умення не толькі «закруціць» сюжэт, але і так званага «прыгожага пісьменства», калі чытаць – ужо задавальненне.

Гутарыла
Алена Босава,
для lit-bel.org

Музеі Гомельшчыны і Чарнігаўшчыны шукаюць сумесныя рашэнні

Адразу два вялікія мерапрыемствы з удзелам музеяў Гомельскай вобласці прайшлі ў Чарнігаве ў межах праекта «Ад партнёрства мясцовых музеяў да шырокага трансгранічнага супрацоўніцтва» («Дняпроўскі паром»), што фінансуецца сумесна з Еўрапейскім саюзам у межах Праграмы тэрытарыяльнага супрацоўніцтва краінаў Усходняга партнёрства ЕаРТС Беларусь – Украіна. Два дні, 11 і 12 чэрвеня, ішла праца Міжнароднага музейнага форуму «Мясцовыя музеі: новыя формы і інавацыі», а 13-14 чэрвеня адбыўся воркшоп па распрацоўцы новага турыстычнага маршруту, які змог бы звязаць гомельскія і чарнігаўскія музеі.

Цікавасць да форуму была велізарная – з беларускага боку ў ім прынялі ўдзел 10 музеяў з Гомельскай вобласці і мемарыяльны музей-майстэрня З.І. Азгура, а з украінскага – 23, сярод якіх Львоўскі гістарычны музей, Нацыянальны музей мастацтваў імя Багдана і Барбары Ханенкаў у Кіеве і музеі Чарнігаўскай вобласці.

Адна з груп беларускіх і ўкраінскіх музейшчыкаў пад кіраўніцтвам дырэктара Мемарыяльнага музея-майстэрні З.І. Азгура Аксаны Багданавай распрацоўваюць новы музейны маршрут

Галоўнай задачай форуму было спрыяць развіццю мясцовых музеяў, наладжванню супрацоўніцтва і абмену досведам паміж імі. На думку каардынатараў праекта, трансгранічнае супрацоўніцтва зможа даць музеям Гомельшчыны і Чарнігаўшчыны патрэбны імпульс, каб выйсці на новы ўзровень працы, раскрыць свой унікальны патэнцыял, умацаваць сваю ролю як мясцовых культурных цэнтраў і спрыяць развіццю рэгіёна ў цэлым.

Дакладчыкі казалі пра тэндэнцыі сучаснай музеялогіі, прыводзілі прыклады паспяховых сучасных музеяў у свеце, вывучалі іх досвед, а таксама разважалі аб праблемах мясцовых музеяў: якімі павінны быць музеі XXI ст.? як не ператварыць музей у машыну маркетынгу, менеджменту ці сферу забаваў, а захаваць яго ролю інстытута сацыяльнай памяці, прасторы эстэтычнага і інтэлектуальнага задавальнення? якія ролю і месца музеяў у праблеме «свая/чужая культурная спадчына»? для каго створаны музей? хто, калі і навошта яго наведвае? якая роля музея ў жыцці мясцовай супольнасці?

Прадстаўнікі дзяліліся досведам паспяховай рэалізацыі праектаў у музеях, бачаннем і ўвядзеннем інтэрактыўных сродкаў у экспазіцыях, маркетынгавымі мерапрыемствамі па пошуку і прыцягненні менавіта свайго наведніка.

А вось воркшоп перанакіраваў музейшчыкаў ад тэорыі да практыкі: яго задачай было злучыць трансгранічным маршрутам музеі Чарнігаўшчыны і Гомельшчыны. З дапамогай знешніх экспертаў тры незалежныя адна ад адной каманды з прадстаўнікоў 18 музеяў Гомельскай і Чарнігаўскай абласцей правялі двухдзённы «мазгавы штурм».

Што ў музеях і па-за іх сценамі яднае Гомельскую і Чарнігаўскую землі, а што робіць іх унікальнымі? Якія праблемы рэгіёна маршрут мог бы адлюстроўваць? Як паказаць праз музеі жыццё і гісторыю мясцовых жыхароў, паселішчаў? Як зрабіць тэму маршруту па-сапраўднаму значнай для саміх музейных работнікаў, жыхароў рэгіёна і турыстаў? У адказах на гэтыя і іншыя пытанні кожная з групаў паступова фармавала сваё бачанне міжмузейнага маршруту.

Важнай умовай было, каб маршрут адпавядаў мэтам развіцця суседніх абласцей, прапаноўваў інавацыйныя падыходы і ўвасабляў актуальныя тэндэнцыі сучаснай музейнай працы, што маглі б даць музеям новы штуршок для развіцця.

Плёнам сумеснай працы беларускіх і ўкраінскіх музейшчыкаў сталі тры неардынарныя праекты маршрутаў па музеях і прасторы вакол іх. У далейшым на іх аснове каардынацыйная група і кансультанты праекта будуць распрацоўваць канчатковы варыянт трансгранічнага міжмузейнага турыстычнага маршруту па рэгіёне.

Але, на думку кансультанта праекта, культурнага антраполага, выкладчыка Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта ў Вільні Сцяпана Стурэйкі, каштоўнасць падобных мерапрыемстваў не толькі ў практычных напрацоўках. «Мы спрабавалі выбіць удзельнікаў форуму і воркшопа са звыклай каляіны музейнай працы, насыціць іх новымі ідэямі, натхніць на пошук новых сувязяў паміж музеямі, іх калекцыямі, жыццём рэгіёна. І калі ў нас хоць трохі атрымалася, то гэта поспех!»

А самі музейшчыкі адзначылі, што і форум, і воркшоп, як і іншыя мерапрыемствы праекта «Ад партнёрства мясцовых музеяў да шырокага трансгранічнага культурнага супрацоўніцтва», дапамаглі ім даведацца больш адно пра аднаго, умацаваць прафесійныя сувязі, што завязаліся за час праекта, а таксама з іншага боку зірнуць на музеі, дзе працуюць яны самі.

Марыя МАРКЕВІЧ,
PR-менеджар праекта
Фота Сямёна ШАЎЦОВА

Узнагароджанне ўдзельнікаў воркшопа

Эстонцы на Мірскай зямлі

У Мірскай гарпасялковай бібліятэцы адбылася сустрэча па абмене досведам паміж бібліятэкарамі Карэліцкага раёна і іх калегамі з эстонскага горада Вільяндзі. Гасцей вітала начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Карэліцкага райвыканкама І. Санчук.

Дырэктар Карэліцкай раённай бібліятэкі Л. Арцюх расказала аб структуры бібліятэчнай сеткі раёна, асноўных задачах і метадах працы бібліятэк, праграмных акцыях і мерапрыемствах, скіраваных на паляпшэнне асблугоўвання чытачоў.

Бібліятэкары з Вільяндзі зацікавіліся такой формай абслугоўвання насельніцтва, як бібліобус. Аб ёй яны пачулі ўпершыню. Гасцей цікавілі пытанні камплектавання фондаў бібліятэк, павышэння адукацыі бібліятэкараў, метадаў абслугоўвання наведнікаў.

Дырэктар Вільяндскай гарадской бібліятэкі Рэт Лубі выказала спадзяванне, што гэтая сустрэча стане першым крокам да супрацоўніцтва паміж бібліятэкамі Беларусі і Эстоніі.

Марына РОЎДАН,
метадыст Карэліцкай раённай бібліятэкі

Тлінкіт Саўчанка ў святле ліста з Кадзьяка ў Сан-Францыска

У «Архіве рускай царквы на Алясцы» (The Alaskan Russian Church Archives) у Бібліятэцы Кангрэса ЗША (Вашынгтон) захоўваюцца два ў вышэйшай ступені краязнаўчыя лісты, якія ўказваюць (ускосна, але вельмі ясна і яскрава) на нацыянальны склад беларуска-расійскага памежжа і ўжо прыкметную прысутнасць беларусаў на Ціхаакіянскім узбярэжжы Амерыкі (Аляска і Каліфорнія) у XIX ст. Яны з'яўляюцца аднымі з найбольш цікавых дакументаў, якія мы сустракалі за час вывучэння беларуска-індзейскіх сувязяў, што мэтанакіравана вядзецца з 1984 г. Больш позні, трохі больш кароткі, менш пісьменны, затое больш інфарматыўны ліст цытуем цалкам з карэкцыяй арфаграфіі і пунктуацыі ў нашым перакладзе з рускай мовы:

«Кадзьяк, лістапад 26, 1891, у Рускую Эклезіястычную Кансісторыю Аляскі, Сан-Францыска. Я, ніжэйпадпісаны, прашу згадаць маё Духоўнае праўленне вызваліць на час майго сына Мікалая ад занятку яго ўдзячнага вучэння на чаканне пры першым выпадку, што будзе адбывацца, у Кадзьяк. Калі ж ён пажадае назад зваротна, то я магу яго адправіць на сваю аснову. Зрабіце Божую ласку, праасвяшчэннейшы Уладыка. Я маю задавальненне ўбачыць майго сына Мікалая. Мы цяпер хварэем, бог ведае, што будзе. Дзімеян Саўчэнікаў».

У першым лісце, ад 17 (29) кастрычніка 1890 г., напісаным іншай рукою і падпісаным не «Димеан Савчеников», а «Демиан Савченко», – такая ж просьба пра часовае вяртанне Мікалая да бацькоў. У царкоўнай школе ў Сан-Францыска яго настаўнікам (геаграфіі, прынамсі ў пачатку 1888/1889 навучальнага года) быў псаломшчык, а потым святар Мікалай Грынкевіч; а клапаціўся пра яго здароўе, выступаў у абарону, за правы як вучня ў ліку іншых у «бурсе», знакаміты доктар Русель (Мікалай Судзілоўскі. – **«КГ»**). Абодва паходзілі з Магілёўскай губерні (у якой таксама жылі сваякі і цёзкі па прозвішчы консула ў Сан-Францыска Уладзіміра Арцімовіча). А з ёю межаваў Краснінскі павет (паводле афіцыйных дадзеных, што папулярызуюцца ў наш час, – прыкладна 95 і 90 % беларусаў адпаведна ў сярэдзіне і канцы XIX ст.) Смаленскай губерні. Менавіта з горадам Красны (тагачасны «Красной») і звязаны Іосіф Якаўлевіч Саўчанка, верагодны дзед хлопчыка. Драматычная гісторыя Саўчанкаў на Алясцы, якая пачынаецца з 1830-х гг., дасягнула своеасаблівага апагея ў гэтых лістах, якія, відавочна, толькі ініцыююць «дэтэктыўны» шэраг пытанняў: чаму ў аднаго з вучняў-сіротаў у Сан-Францыска, з той часткі школьнага калектыву, якую, паводле заявы ў мясцовай газеце, складаюць «all Esqimaux-Indians», такое роднае беларусам і ўкраінцам прозвішча і чаму яго ветліва, цярпліва, але настойліва выклікаюць дадому, на Аляску.

Сын «краснінскага мешчаніна» Восіпа Саўчанкі (або Саўчанкава, у адаптаваным да рускага вуха выглядзе) Дзям'ян, народжаны 1 ліпеня 1845 г., верагодна, на курыльскім востраве Сімусір (Сімушыр), дзе атрымаў сваё імя – быў «baptized» бацькам праз чатыры дні пасля нараджэння [версія, што ў Нова-Архангельску (ад 1867 г. горад Сітка. – **«КГ»**)], куды сям'я вярнулася, праўда, увосень 1846 г., звязаная з тым, што ў сталіцы Рускай Амерыкі ён быў хрышчоны (chrizmated або chrismated) святаром Пятром Літвінцавым; з-за рэдкіх наведванняў вострава святарамі старэйшы брат Павел быў «baptized» бацькам праз два дні, але «chrizmated», іераманахам Мікалаем, праз яшчэ большы час пасля нараджэння, чым Дзям'ян, нават калі не быў біялагічным бацькам Мікалая, выхоўваў яго разам са сваёй жонкай-тлінкіткай Марыяй і яе пляменніцай Аграфенай з дня з'яўлення на свет. Прычына таго, чаму 12 – 13-гадовага хлопчыка (нарадзіўся 9 снежня 1877 г.) чакалі назад не на тлінкіцкай этнічнай тэрыторыі, а на востраве Кадзьяк, дзе карэнным насельніцтвам былі эскімосы (інакш – алуціі або суглпіяк), магла быць у тым, што туды Дзям'яна прывяла неабходнасць, звязаная з працай, ці іншая сямейная (ён ужо жыў там у 1855 – 1857 гг., пасля смерці бацькі, з маці і братам Паўлам, а таксама на працягу некалькіх месяцаў у канцы 1847 – пачатку 1848 г. і другой паловы 1851 г., калі з імі яшчэ быў бацька). Хаця Восіп Саўчанка ажаніўся з Ганнай Кацельнікавай (якая паводле версіі гісторыка Андрэя Грынёва была дачкой «мясцовай тубылкі», а на думку бібліёграфа рэгіянальнай аляскінскай і палярнай літаратуры і куратара рэдкіх кніг і рэдкіх карт Кэтрын Арнт была прывезеная з Ахоцка) у 1841 г. у Нова-Архангельску, ужо ў тым жа годзе ён быў прызначаны байдаршчыкам вострава Сімусір, а пазней начальнікам (байдаршчыкам) вострава Укамак (Чырыкава, блізу 130 км на паўднёвы захад ад вострава Кадзьяк).

У школе былі хлопчыкі, якія прыехалі з Расіі і Аляскі, для якіх прасочваюцца продкі або сваякі з прозвішчамі, што часта гавораць самі за сябе: у расійскай групе Зайчанка, Карнялюк, менш выразна – Гумоўскі, Санецкі і Мартыш выдаюць украінцаў (школьнікі Васіль, Мікалай і Раман Мартышы і настаўнік – іх бацька, дыякан Аляксандр могуць прадстаўляць і заходняе адгалінаванне ўсходніх славянаў, вядомае як русіны), але ў аляскінскай групе мы не знаходзім, акрамя Саўчанкі, носьбітаў прозвішчаў «беларуска-ўкраінскага» тыпу. «Справядлівасць» гісторыі ў тым, што сярод аляскінскіх прозвішчаў у школе, пераважна руска-крэольскіх па форме ў суседстве з двума-трыма, што гучаць як эскімоска-алеуцкія, а таксама як мінімум адным індзейскім, ірландскім, скандынаўскім, ёсць і беларускае, няхай сабе і такое, якое многімі ўспрымаецца як украінскае. Тое, што ў нашым выпадку яно адносіцца да беларускіх, паказвае антрапанімічны матэрыял па Смаленскай, Віцебскай і Пскоўскай абласцях – тэрыторыях, што дэманструюць большую мабільнасць і актыўнасць насельніцтва ў каланізацыйным працэсе ў Рускай Амерыцы ў параўнанні з іншымі часткамі Беларусі і Украінай.

Непрацягламу апошняму перыяду існавання (1888 – 1892) багаслоўскай навучальнай установы, што функцыянавала пасля пераносу разам з кафедрай з Сіткі ў Сан-Францыска ў 1872 г., прысвечаны наш Грынкевічаўскі даследчы і перакладчыцкі праект «Пра школу».

Алесь СІМАКОЎ,
г. Гомель

Епіскап Мікалай (у цэнтры) і школьнікі (фота з кнігі А. Яфімавай і А. Ласаевай «Алеутская и Северо-Американская епархия при святителе Тихоне», 2012)

P.S. *Гэтае паведамленне рыхтавалася ў сувязі з круглай лічбай у 700 нумароў у гісторыі нашай любімай «Краязнаўчай газеты» і яе 15-годдзем. «КГ» з яе шырокім поглядам на свет не абмінула сваёй увагай алясказнаўства. Царкоўнае ж, рэлігіязнаўчае краязнаўства – сталая тэма газеты, што мы бачым па публікацыях Мікалая Шуканава, колішняга члена Беларуска-індзейскага таварыства. Былі б рады праінфармаваць захопленых краязнаўствам Беларусі аб тым, што зможам знайсці звесткі пра далейшыя прыгоды Мікалая Саўчанкі і яго блізкіх – гэтых сапраўды блізкіх нам людзей за акіянам. У гэтым нам дапамагаюць аляскінскія даследчыкі розных спецыяльнасцяў, некаторых з якіх можна аднесці да амаль класічных краязнаўцаў; хацелася б спадзявацца і на ўдзел амерыканскіх беларусаў, беларусаў і краязнаўцаў Смаленшчыны.*

Іван Камера нарадзіўся ў в. Малыя Жухавічы на Карэліччыне 15 (27) снежня 1897 г. у шматдзетнай сялянскай сям'і. Пачатковую адукацыю атрымаў у царкоўна-прыходскай школе роднай вёскі, вучыўся ў рамесным вучылішчы, пасля заканчэння якога падаўся на заробкі ў Петраград. Там працаваў токарам на заводзе, але яго звольнілі за ўдзел у забастоўках.

Абаронца Масквы з-пад Карэлічаў

Як сведчаць дакументы, у ліпені 1918 г. Іван Паўлавіч быў мабілізаваны ў Чырвоную Армію. У час грамадзянскай вайны служыў ваенкамісарам 6-га Петраградскага палка, пазней заняў тую ж пасаду ў гаўбічным артылерыйскім дывізіёне 27-й дывізіі 5-й арміі спачатку на Усходнім фронце, потым – на Заходнім у 15-й і 16-й арміях. Браў удзел у баях супраць войскаў Калчака, затым ваяваў з белапалякамі.

У лістападзе 1920 г. І. Камера стаў курсантам Вышэйшай артылерыйскай школы Петраграда, праз некалькі гадоў быў прызначаны камандзірам 25-га конна-артылерыйскага дывізіёна 5-й Асобай кавалерыйскай брыгады. У 1929 – 1930 гг. наш зямляк з байцамі Асобай Далёкаўсходняй арміі пад камандаваннем В. Блюхера ўдзельнічаў у баях з ворагам у раёне Кітайска-Усходняй чыгункі. За мужнасць і адвагу яшчэ ў 1930 г. атрымаў першую высокую ўзнагароду – ордэн Чырвонага Сцяга.

У 1933 г. стаў начальнікам артылерыі Першай Ціхаакеанскай стралковай дывізіі. Праз тры гады скончыў артылерыйскія камандныя курсы і ў 1938 г. быў прызначаны начальнікам артылерыі стралковага корпуса, а ў 1940 г., атрымаўшы званне генерал-маёра, заняў пасаду начальніка артылерыі Паўночна-Каўказскай ваеннай акругі. За ўдзел у вайне з белафінамі ў тым жа 1940 г. атрымаў ордэн Леніна.

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны Івана Паўлавіча прызначылі начальнікам артылерыі 19-й арміі Заходняга фронту. Чырвоная Армія вяла цяжкія абарончыя баі супраць большых нямецка-фашысцкіх войскаў. У гэтых баях немалаважную ролю адыграла артылерыя пад камандаваннем І. Камеры, з цяжкасцю стрымліваючы атакі ворага.

У лістападзе 1941 г. наш зямляк стаў намеснікам камандуючага войскамі і ўзначаліў артылерыю Заходняга фронту, войскі якога ўдзельнічалі ў абарончых аперацыях на подступах да Масквы. Пад час баёў гітлераўцы панеслі вялікія страты, быў сарваны іх план маланкавага наступлення. У снежні 1941 – студзені 1942 г. арміі Заходняга фронту прынялі ўдзел у контрнаступленні пад Масквой, разбілі і адкінулі варожыя войскі ад горада. 27 снежня 1941 г. Іван Паўлавіч атрымаў званне генерал-лейтэнанта артылерыі і быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, а ў наступным годзе атрымаў другую такую ж узнагароду.

У 1943 г. арміі Заходняга фронту ліквідавалі ржэўска-вяземскі плацдарм гітлераўцаў. У гэты час наш зямляк быў узнагароджаны ордэнамі Суворава 1-й і 2-й ступеняў, у чэрвені 1943 г. яму было прысвоенае званне генерал-палкоўніка артылерыі. У канцы 1943 – пачатку 1944 г. войскі Заходняга фронту наступалі на віцебскім і аршанскім напрамках. За ўмелае вядзенне баёў І. Камера быў узнагароджаны чацвёртым ордэнам Чырвонага Сцяга і ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені.

На жаль, незадоўга да вызвалення родных мясцінаў, у маі 1944 г., Іван Паўлавіч трапіў у шпіталь, па стане здароўя не змог болей удзельнічаць у баях і вымушаны быў пайсці ў адстаўку. Пасля вайны жыў у Маскве, дзе 21 студзеня 1952 г. скончыўся яго жыццёвы шлях. Памяць пра мужнага воіна зберагаюць музеі Беларусі.

Святлана КОШУР, г. Карэлічы

Георгіеўскія кавалеры Гомельшчыны: біяграфічны летапіс

(Заканчэнне. Пачатак у №№ 23–24)

Чваркоў Ігнацій Кузьміч

Нарадзіўся ў 1888 г. Месца нараджэння: Магілёўская вобл., Гомельскі пав., в. Стаўбун – цэнр Стаўбунскай воласці (Гомельская вобл., Веткаўскі р-н, аг. Стаўбун – цэнтр Стаўбунскага с/с).

З бедных сялянаў. Прызваны на вайсковую службу ў 1910 г. і залічаны ў 160-ы пяхотны Абхазскі полк. Прайшоў навучанне ў палявой вучэбнай камандзе і ў хуткім часе атрымаў чын малодшага унтэр-афіцэра, потым – старшы унтэр-афіцэр. Выконваў абавязкі памочніка камандзіра ўзвода. Пасля заканчэння школы падпрапаршчыкаў Чваркову быў нададзены адпаведны чын.

Удзельнік Першай сусветнай вайны. Паранены пад польскім горадам Лодзь, знаходзіўся ў шпіталі, пасля выздараўлення вярнуўся ў сваю часць. За мужнасць і гераізм у баях Ігнацій Кузьміч быў узнагароджаны трыма Георгіеўскімі крыжамі і адным Георгіеўскім медалём, за баявыя адзнакі яму быў нададзены чын прапаршчыка, а затым – першы афіцэрскі чын падпаручніка. Адпаведна камандаваў узводам, затым – ротай. Вызначыўся прыкладным нясеннем службы і асабістай храбрасцю. Да кастрычніка 1917 г. даслужыўся да штабс-капітана і атрымаў ордэн Святога Станіслава.

Калі імператарская армія пачала развальвацца і ў многіх часцях распачалася так званая «самадэмабілізацыя», былы царскі афіцэр вярнуўся ў родныя мясціны. Прымаў актыўны ўдзел у станаўленні Савецкай улады ў Гомельскім пав. Гомельскім павятовым камісарыятам быў прызначаны ў Стаўбунскую вол. ваенным кіраўніком па барацьбе з дэзертырствам і бандытызмам. На гэтай пасадзе праявіў сябе добрым арганізатарам, які забяспечваў выкананне складанай баявой задачы.

У чэрвені 1919 г. Ігнацій Кузьміч быў мабілізаваны ў рады Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і прызначаны ка-

Ігнацій Чваркоў

мандзірам 8-й роты 66-га стралковага палка 8-й стралковай дывізіі, у складзе якой браў актыўны ўдзел у баявых дзеяннях з польскай арміяй. Пазней – начальнік палкавой каманды пешай разведкі. На гэтых камандных пасадах з асаблівай паўнатой разгарнуўся яго ваенны талент.

Рэўваенсавет Рэспублікі ўзнагародзіў І. Чваркова ордэнам Чырвонага Сцяга. У 1920 г. ён непрацяглы час працаваў у штабе Заходняга фронту. Па заканчэнні так званай савецка-польскай вайны восенню 1920 г. ён быў адкамандзіраваны ў склад войскаў ВЧК, змагаўся з бандытызмам.

У канцы 1921 г. вярнуўся да службы ў 8-й стралковую дывізію. Быў прызначаны камандзірам роты 64-га стралковага палка, што стаяў на ахове заходняй дзяржаўнай мяжы. Полк ахоўваў дзяржаўныя рубяжы да жніўня 1922 г., калі яго змянілі спецыяльныя пагранічныя войскі, пасля чаго пехацінцы вярнуліся да месца ранейшай дыслакацыі ў г. Бабруйск. Неўзабаве І. Чваркоў звольніўся ў запас і вярнуўся на радзіму.

Ігнацій Кузьміч прымаў актыўны ўдзел ва ўмацаванні Савецкай улады ў Пасожжы, у 1931 г. быў адным з калгасных арганізатараў у родных мясцінах, першым уступіў у стаўбунскі калгас «Звязда». Шмат гадоў з'яўляўся членам выканаўчага камітэта Свяцілавіцкага раённага Савета дэпутатаў працоўных (Свяцілавіцкі р-н існаваў у 1926 – 1927 і ў 1935 – 1956 гг.; пасля скасавання яго тэрыторыя была зноў перададзеная ў Веткаўскі і Чачэрскі р-ны). Ён ніколі не парываў сувязяў з Узброенымі Сіламі. Працуючы начальнікам шэрагу вучэбных пунктаў дапрызыўнай моладзі, падрыхтаваў да службы не адно пакаленне маладых воінаў. Маладыя людзі ішлі ў армію, потым вярталіся, а Ігнацій Кузьміч займаўся з новай зменай. Як патрыёт, што прайшоў вялікі баявы і жыццёвы шлях, ён доўгі час перадаваў свой досвед, традыцыі маладой змене.

У год пяцідзесяцігоддзя Кастрычніцкай рэвалюцыі быў узнагароджаны як актыўны ўдзельнік усталявання Савецкай улады.

Пайшоў з жыцця ў 1983 г. Пахаваны ў роднай вёсцы.

Узнагароды: Георгіеўскія крыжы 2-й, 3-й (двойчы; другі заменены на 2-ю ступень) і 4-й ступеняў; Георгіеўскі медаль 4-й ступені; ордэн Святога Станіслава 3-й ступені з мячамі і бантам; ордэн Чырвонага Сцяга РСФСР.

Па архіўных дадзеных і публікацыях у інтэрнэце.

Канстанцін ГАЙДУКОЎ, Барыс МАЦВЕЕЎ, г. Віцебск

Папярэднія публікацыі па тэме чытайце ў №№ 39–43, 45–48 за 2017 г., №№ 1, 8–12, 23, 24 за 2018 г.

Салдаты перад ранішнім пастраеннем

Ліпень

11 – Клімавіцкі раённы краязнаўчы музей (1978) – 40 гадоў з часу заснавання (адкрыты 24.07.1984).

11 – 17 – «Магутны Божа» (Магілёў; 1993), міжнародны фестываль духоўнай музыкі – 25 гадоў з пачатку правядзення.

11 – Паліканіна Валянціна Пятроўна (1958, Крычаў), паэтэса, журналіст, перакладчык, лаўрэат прэміі Беларускага саюза журналістаў (2003), спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2006), прэміі Саюза пісьменнікаў Беларусі «Залаты Купідон» (2008) – 60 гадоў з дня нараджэння.

12 – Лойка Павел Алегавіч (1958, Слонім – 2010), вучоны-гісторык, які займаўся даследаваннем праблемы аграрнай гісторыі Беларусі XVI – XVIII стст., вывучаў дзяржаўна-палітычнае развіццё ВКЛ у XVI ст. – 60 гадоў з дня нараджэння.

12 – Шышкін Мікалай Мікалаевіч (1918, Веткаўскі р-н – 2000), артыст эстрады, спявак, заслужаны артыст Беларусі – 100 гадоў з дня нараджэння.

13 – Марухін Юрый Аляксандравіч (1938 – 2001), кінаператар, рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі – 80 гадоў з дня нараджэння.

15 – Беларускі дзяржаўны тэатр лялек (Мінск; 1938), заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь – 80 гадоў з часу адкрыцця.

15 – Шабалін Аляксандр Андрэевіч (1938, Пухавіцкі р-н – 2013), публіцыст, празаік, аўтар сцэнарыяў дакументальных тэлевізійных і мастацкіх фільмаў, заслужаны дзеяч культуры Беларусі – 80 гадоў з дня нараджэння.

17 – Венгерка Аляксандр (1893–1941), польскі акцёр, рэжысёр, педагог, мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага польскага тэатра БССР (г. Беласток; 1939–1941) – 125 гадоў з дня нараджэння.

18 – Палескі дзяржаўны радыяцыйна-экалагічны запаведнік, адзіны ў свеце запаведнік такога тыпу (Брагін., Хойн. і Нараўл. р-ны; 1988) – 30 гадоў з пачатку дзейнасці.

20 – Кашталапаў Анатоль Міхайлавіч (1948, г. Магілёў), танцоўшчык і музыкант, заслужаны артыст Беларусі – 70 гадоў з дня нараджэння.

20 – Куляшова Галіна Рыгораўна (1928, г. Гомель – 2005), музыказнавец, педагог, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1998) – 90 гадоў з дня нараджэння.

23 – Бельскі Алесь (Аляксандр) Іванавіч (1963, Капыльскі р-н), беларускі літаратуразнаўца, пісьменнік, педагог, доктар філалагічных навук, прафесар – 55 гадоў з дня нараджэння.

Носьбіт высокага духу

Да 215-годдзя з дня нараджэння Адольфа Янушкевіча



Уздоўж

1. Горад на Міншчыне, дзе 9 чэрвеня 1803 года ў сям'і Міхала, падпалкоўніка польскай арміі, нарадзіўся беларускі падарожнік, пісьменнік, паэт, актыўны ўдзельнік паўстання 1830 – 1831 гг. Адольф Янушкевіч. **4**. Паэма А. Міцкевіча, у якой прататыпам рэвалюцыянера Адольфа паэту паслужыў А. Янушкевіч. **7**. «Не патрэбна табе ні багацце, ні ..., // Бо Айчына – і ..., і наш супакой». З верша В. Шніпа «Балада Адольфа Янушкевіча». **9**. Сімвал паэзіі. **10**. Маленькі агурок, прызначаны для марынавання. **12**. Сістэма абазначэнняў, сігналаў, якія перадаюць інфармацыю. **13**. Пакаты спуск. **15**. Драўляны брусок з дзяленнямі для вымярэння чаго-небудзь. **17**. Акцёр, выканаўца камічных роляў. **18**. Невялікая лугавая птушка; тое, што і дзяркач. **20**. Аповесць рускага пісьменніка І. Тургенева, які цікавіўся творчасцю А. Янушкевіча. **21**. Імя брата Адольфа, вядомага беларускага выдаўца, паэта, актыўнага ўдзельніка паўстання 1830 – 1831 гг., які ў г. Парыжы выдаў кнігу «Жыццё Адольфа Янушкевіча і яго лісты з кіргізскіх стэпаў». **24**. Вялікіх памераў карціна на палатне. **26**. ... Кукан-баеў. Імя пачынальніка казахскай літаратуры, якога, зусім яшчэ маленькага, ссыльны царскім урадам А. Янушкевіч лячыў ад хваробы. **27*.** «Дык шануй, беларус, сваю мову – // Гэта ... нам на вечныя годы». З верша Алеся Гаруна «Ты, мой брат, каго завуць беларусам...». **28**. Сталіца Рэспублікі Казахстан, горад, адна з цэнтральных вуліцаў якога названая імем А. Янушкевіча; яго імя носіць таксама вуліца ў былой сталіцы гэтай краіны – у г. Алма-Аце.

Упоперак

1. Умоўная велічыня, адносна якой вызначаецца тэмпература чаго-небудзь. **2**. Уладзіслаў .... Прозвішча беларускага паэта-гуманіста, пісьменніка, публіцыста, аўтара цыкла санетаў «Успаміны пра Нясвіж» і інш. Сёлета – 195 гадоў з дня яго нараджэння. **3*.** Асадак на дне вадаёмаў. **5*.** Тамаш ..., Ян Чачот; Беларускія паэты-філаматы, удзельнікі рэвалюцыйнага руху супраць царскай Расіі, з якімі А. Янушкевіч пасябраваў пад час вучобы ў Віленскім універсітэце. **6*.** Клаўдзій ...-Душэўскі. Вядомы дзеяч Беларускай Народнай Рэспублікі, выдавец, журналіст, лічыцца стваральнікам бел-чырвона-белага сцяга. **8*.** Паляўнічая сумка для дзічыны. **11*.** Нацыя, насельніцтва, якое аб'ядноўвае агульная мова, культура, побыт; А. Янушкевіч у сваіх падарожных нататках сцвярджаў, што казахі – ..., а не дзікае пляма, як яго лічыў царскі ўрад. Удзячныя казахі ўганаравалі А. Янушкевіча званнем Народнага героя Казахстана. **12**. Ранейшая назва г. Дзяржынска, непадалёк якога ў в. Дзягільна знаходзіўся маёнтак Янушкевічаў, а на старых (панскіх) могілках знайшлі вечны супакой Адольф, яго маці і іншыя родзічы. У 2013 г. могілкі наведала казахская дэлегацыя на чале з Паслом Рэспублікі Казахстан у Беларусі сп. Е. Булігенавым. **14**. ... Сакалоўская. Імя маці А. Янушкевіча, якая даводзілася Тадэвушу Касцюшку стрыечнай унучкай. **16*.** 8-радковы верш. **19*.** «Наша ж ... – цудоўная, спеўная, // Умее спелым калоссем шумець». З верша Н. Арсенневай «Жыве Беларусь». **22*.** Рыбалоўная снасць. **23*.** Зямельная мера ў некаторых краінах. **25*.** Вялікі майстар сваёй справы.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ

Малая краязнаўчая энцыклапедыя

(Пачатак у № 1 за 2003 год)

ПАСТА́ВЫ (*працяг артыкула*). У 1970 г. у Паставах налічвалася 15,1 тыс. жыхароў, у 2001 г. – 21,1 тыс., 2010 г. – 19,8 тыс., 2014 г. – 20,1 тыс. чал.; 2017 г. – 19 882 чал.

Працуе Пастаўскі краязнаўчы музей. Выходзіць раённая газета «Пастаўскі край», ёсць тэлебачанне «Паставы ТБ».

У горадзе з 1992 г. праводзіцца фестываль народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік».

Непадалёк горада, на паўночным беразе возера Задзеўскае, выяўленае паселішча эпохі позняга неаліту і ранняга бронзавага веку (3-е – пачатак 2-га тысячагоддзя да н.э.). На беразе р. Мядзелкі расце Святы Дуб, які застаўся, хутчэй за усё, на месцы язычніцкага капішча.

Пастаўская Свята-Мікалаеўская царква

Пастаўская Свята-Мікалаеўская царква – помнік архітэктуры псеўдарускага стылю. Пабудаваная ў 1894 г. на цэнтральнай плошчы з цэглы, атынкаваная. Асноўны прамавугольны ў плане аб'ём храма выцягнуты па папярочнай восі. Да яго прымыкаюць закругленая апсіда, дадатковы аб'ём і бабінец з ганкам; па баках апсіды і бабінца размешчаныя дапаможныя памяшканні. Асноўны аб'ём завершаны традыцыйным пяцігалоўем, бабінец – шатровай званіцай з галоўкай. У дэкоры фасадаў выкарыстаныя какошнікі, арнаментальныя паяскі, ліштвы, паўцыркульныя нішы. Інтэр'ер зальны з плоскаю столлю. Царква дзейнічае.

Пастаўскі касцёл Антонія Падуанскага – помнік архітэктуры неаготыкі. Пабудаваны ў 1898 – 1904 гг. архітэктарам А. Гойбелем на правым беразе р. Мядзелка, на тэрыторыі былога драўлянага францысканскага манастыра, заснаванага ў 1617 г. на сродкі Станіслава і Ганны Сянкевічаў-Бяганскіх. Спачатку быў пабудаваны драўляны крыжападобны ў плане храм з купалам у сяродкрыжжы і з 2 капліцамі і 2 сакрысціямі па баках. У 1898 г. драўляны касцёл разабраны і на яго фундаменце (з выкарыстаннем былых падвалаў) пачалося будаўніцтва мураванага касцёла.

(Працяг артыкула ў наступным нумары)

Пастаўскі касцёл Антонія Падуанскага

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 08 мая 2014 г. Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры»; Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Вітольд Ермалёнак, Алесь Карлюкевіч, Людміла Кірухіна, Адам Мальдзіс, Сяргей Мітраховіч, Вячаслаў Рагойша, Павел Сапоцька, Віктар Скорабагатаў, Тадэуш Стружэцкі.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283-28-26. Тэл./факс 334-42-03
E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 05.07.2018
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14). Ліцэнзія ЛП № 02330/85 ад 23.01.2014.
Заказ 410.
Тыраж 456 асобнікаў.